# Сябар на ўсё жыццё

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна з'ўляецца адной з буйнейшых у краіне. Больш шасці мільёнаў кніг налічваюць яе фонды. Сярод рэдкіх—першыя выданні твораў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна. Спецыялісты і вучоныя могуць пазнаёміцца са старадрукаванымі і рукапіснымі выданнямі.

Больш як трыццаць сем тысяч чытачоў карыстаюцца паслугамі бібліятэкі. Для кожнага з іх кніга стала сябрам і дарадчыкам на ўсё жыццё.







● Супрацоўнікі бібліятэкі ўважліва сочаць за станам захаванасці сучасных выданняў і старажытных кніг. Шмат пашкоджаных часам тамоў, газет, часопісаў аднавілі рэстаўратары І. ІВАШЧАНКА і Г. ГЛУХОЎСКАЯ.

● Прасторныя чытальныя залы адкрыты для наведвальнікаў. Тут можна атрымаць спецыяльную літаратуру па розных галінах ведаў.

● У фондах захоўваюцца старадрукаваныя і рукапісныя кнігі, якія дайшлі да нас з далёкіх стагоддзяў. Сярод іх выданні беларускіх першадрукароў, заходнееўрапейскія інкунабулы.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.